Крукоўскі М.І.,
прафесар

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА І АВАНГАРДЫЗМ: МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ

1. Праблема ўзаемаадносін традыцый і авангарда ў гісторыі культуры, і асабліва культуры мастацкай, паўстала перад навукай у самым пачатку XX ст., хоць адпавядаючыя ёй факты ўзнікаюць ужо напрыканцы XIX ст. Асабліва востра гэтая праблема стаіць перад беларускай культуралогіяй, дзе яна мае не толькі тэарэтычнае, але і практычнае значэнне ў сувязі з задачай адраджэння беларускай нацыянальнай культуры і неабходнасці выбару шляхоў далейшага яе развіцця. Названая праблема цесна звязана ў сваю чаргу з праблемамі развіцця і прагрэсу ў культуры і каштоўнасна-ацэначнага да яе падыходу.

2. Да гэтага часу не існуе агульнапрынятага погляду на праблему развіцця і прагрэсу ў культуры як цэласную сістэму. Гісторыя кожнага са складаючых яе асноўных пластоў вывучалася паасобку: гісторыя духоўнай культуры (рэлігіі, філасофіі, навукі), гісторыя матэрыяльнай культуры (рамёстваў, прамысловасці, сельскай гаспадаркі), гісторыя культуры мастацкай (літаратуры, жывапісу, архітэктуры і г.д.). Асабліва характэрна гэта было для савецкай культуралогіі. З азначаных трох пластоў культуры найбольш развітай аказалася ў навуковым плане гісторыя мастацтва з-за адносна меншай яго ідэалагізаванасці.

3. У гісторыі мастацтва існаваў і існуе таксама дастаткова шырокі спектр канцэпцый, пачынаючы са сцвярджэння, што ў мастацтве ўвогуле не бывае прагрэсу, і канчаючы прыпісваннем яму такога ж бясконца прагрэсіўнага развіцця, як і ў навуцы. Адсюль і два крайнія падыходы да ацэнкі традыцый і авангарда. Згодна з першым традыцыя - гэта праява вечных, класічных каштоўнасцей, а авангард, у якой бы ён форме ні выявіўся, - нешта часовае, фальшывае, памылковае. Згодна з другім, наадварот, традыцыя ёсць толькі мёртвае мінулае, што тармозіць з'яўленне новага, а авангард - гэта новае, і менавіта таму толькі авангард і ўяўляе для грамадства каштоўнасць.

4. Існуе, аднак, і канцэпцыя развіцця мастацтва і культуры ўвогуле, якая імкнецца аб'яднаць у сабе азначаныя дыялектычна процілеглыя крайнасці. Яна ўзыходзіць да гегелеўскай філасофіі, і у прыватнасці эстэтыкі, хоць пэўныя выхады на яе можна бачыць ужо ў Дж.Віка і Вінкельмана. Згодна з Гегелем мастацтва перажывае ў сваім развіцці фазы пад'ёму, росквіту, заняпаду і гібелі ў гісторыі пэўнага народа. Развіццё адбываецца ў выніку спецыфічнага ўзаемадзеяння (барацьбы) ідэі і пачуццёвай формы, у працэсе якой на першай фазе мае месца перавага ідэі як зместу над формай, на фазе росквіту - гарманічнае іх спалучэнне, на фазе заняпаду, наадварот, пераважае ўжо форма над ідэяй, і, нарэшце, на фазе распаду, гібелі мастацтва дадзенай эпохі назіраецца поўнае іх процістаянне. Адпаведна гэтаму па лініі каштоўнаснай ацэнкі азначаныя фазы суадносяцца з такімі асноўнымі эстэтычнымі катэгорыямі, як трагічнае з узнёслым, прыгожае, камічнае з нізкім і пачварным. Праўда, у самога Гегеля азначаныя адпаведнасці яшчэ толькі намячаліся, але намячаліся вельмі выразна. Яны былі ўдакладнены і развіты далей у работах мастацтвазнаўцаў Вёльфліна, Дворжака, Кон-Вінэра і гісторыкаў культуры Данілеўскага, Лявонцьева, Шпэнглера, Тойнбі і Сарокіна, якія перанеслі гэтыя заканамернасці і на культуру ў цэлым. У савецкі час канцэпцыя фазавага развіцця мастацкай культуры ў кантэксце эстэтычнае праблематыкі распрацоўвалася толькі на Беларусі ў БДУ і то афіцыйна не прызнавалася і ўсяляк замоўчвалася.

5. Згодна з гэтай канцэпцыяй мастацкая культура, як і культура ўвогуле, на працягу ўсёй сваёй гісторыі перажывала вышэйазначаныя пад'ём, росквіт і падзенне, якія праяўляліся як заканамерныя змены ў часе мастацкіх стыляў. Гэтыя заканамернасці назіраюцца ў глабальным маштабе і з асаблівай выразнасцю ў мастацтве еўрапейскім, дзе яны выступаюць ужо з часоў Старажытнага Егіпта і антычнага свету. Назіраюцца яны і ў новы час у мастацкім развіцці буржуазнай фармацыі. Фазе яе пад'ёму адпавядаюць Рэфармацыя і ранні Рэнесанс. Росквіт прыходзіцца на Высокае Адраджэнне, а ўся далейшая гісторыя можа разглядацца як паступовая і павольная, іншы раз з перарывамі, як у часы Вялікай французскай рэвалюцыі альбо рэвалюцыі 1917 года ў Расіі. Лінія ж упадку прыняла амаль што катастрафічны характар з пачатку XX стагоддзя. У каштоўнасна-ацэначным плане сучасная мастацкая культура арыентуецца ўжо на эстэтычную катэгорыю пачварнага, у той час як у мастацтве Высокага Адраджэння яна арыентавалася на катэгорыю прыгажосці.

6. У святле азначанай канцэпцыі беларуская мастацкая культура, якая з утварэннем суверэннай і незалежнай Рэспублікі Беларусь уступае ў эпоху свайго адраджэння, пры ўсёй складанасці і навізне гэтага працэсу павінна ў прынцыпе арыентавацца не на дэкаданс і катэгорыю пачварнага, а на ўзнёслую прыгажосць як сімвал яе росквіту ў непазбежна наступаючай будучыні.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКИ